сти [4]. В административной комиссии при ВЦИК 24 ноября 1918 г. состоялся доклад по вопросу об отношении к областному делению. Мнения разделились, часть выступала за сохранение области, другие (в том числе председатель комиссии Я. Свердлов) считали, что области как территориально-административные единицы изжили себя, так как были созданы не по производственному принципу, а по географическому [4].

После отхода немцев в ноябре 1918 г. Красная Армия начала занимать территорию Беларуси. В качестве временных чрезвычайных органов на освобожденной территории были созданы Минский, Бобруйский и Молодечненский военные советы [8, л. 1–13]. 10 декабря 1918 г. Красная Армия освободила Минск.

23 декабря 1918 г. в Москве состоялось заседание комиссии ВЦИК, на котором произошло юридическое оформление Западной области как административно-территориальной единицы РСФСР. А.Ф. Мясников продолжал лоббировать идею сохранения и расширения Западной коммуны (области). По его мнению, в состав Западной коммуны должны были войти: Смоленская (за исключением двух восточных уездов), Витебская, Могилевская, Черниговская, Минская, Виленская и Ковенская губернии с областным центром в Минске [4]. Но высшее большевистское руководство решило по-другому. 25 декабря 1918 г. И.В. Сталин сообщил А.Ф. Мясникову, что ЦК партии согласился с белорусскими большевиками в вопросе образования Белорусской советской республики [4].

Таким образом, после освобождения территории Беларуси от германских войск в конце декабря 1918 г. большевики отказались от идеи восстановления Западной области (коммуны). В начале 1919 г. в силу различных политических, социально-экономических и геополитических причин была провозглашена Социалистическая Советская Республика Белоруссия (ССРБ), а Западная коммуна и Облисполкомзап были ликвидированы.

### *Список использованных источников*

1. Елизаров, С.А. Административно-территориальное деление ССРБ (январь-февраль 1919 г.) / С.А. Елизаров // Актуальные вопросы общественных наук: социология, политология, философия, история : материалы Междунар. заоч. науч.-практ. конф., 20 февр. 2012 г. – Новосибирск : Сиб. ассоц. консультантов, 2012. – С. 103–108.

2. Ігнаценка, І. Кастрычніцкі этап рэвалюцыі / І. Ігнаценка // Гісторыя Беларусі : у 6 т. // рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – Т. 5.

3. Кукса, А.Н. Западная область: минский период (март 1917 – февраль 1918 гг.) / А.Н. Кукса // Наука – обществу, производству, экономике : материалы 11-й Междунар. науч.-техн. конф. : в 4 т. – Минск : БНТУ, 2013. – Т. 4. – С. 59.



4. Кукса, А.Н. Конфликт между Облисполкомзапом и губернскими центрами в 1918 г. / А.Н. Кукса // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зб. навук. прац удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф., г. Магілёў, 25–26 чэрв. 2015 г. / уклад. А.М. Бацюкоў, І.А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2015. – С. 153–159.

5. Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 1. – О. 1. – Д. 1.

6. Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 1. – О. 1. – Д. 2.

7. Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 1. – О. 1. – Д. 5.

8. Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 5. – О. 1. – Д. 2.

9. Стужынская, Н.І. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту / Н.І. Стужынская // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: М.В. Біч [і інш.] ; прадм. М. Ткачова; маст. Э.Э. Жакевіч. – Т. 2 : Беліцк–Гімн / рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1994. – 536 с. – С. 181–182.

10. Сяменчык, М. Савет народных камісараў Заходняй вобласці і фронту / М. Сяменчык // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: М.В. Біч [і інш.] ; прадм. М. Ткачова; маст. Э.Э. Жакевіч. – Т. 6. – Кн. 1: Пузелі – Усая / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – 591 с. – С. 188–189.

УДК 947.6

***А.М. Сувалаў, А.М. Сувалава***

## РАССТАНОЎКА ПАЛІТЫЧНЫХ СІЛ У БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1917 г.

У 1917 г. значны ўплыў на расстаноўку палітычных сіл у Беларусі аказвалі агульнарасійскія партыі і арганізацыі. Гэта тлумачылася цэлым шэрагам фактараў.

Па-першае, у Часовым урадзе і ў Саветах рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў большасць месцаў належала прадстаўнікам менавіта агульнарасійскіх, а не нацыянальных партый, дадзенае становішча натуральным чынам паўтаралася ў мясцовых органах улады. Дамінаванне ў Беларусі было асабліва важна для агульнарасійскіх палітыкаў у сувязі з прыфрантавым становішчам рэгіёна.

Па-другое, агульнарасійскія партыі, валодаючы шырокімі фінансавымі магчымасцямі і добра наладжанай сеткай партыйнага друку, праводзілі сур’ёзную і мэтанакіраваную прапагандысцкую і агітацыйную працу сярод мясцовага насельніцтва.

Па-трэцяе, беларускія нацыянальныя партыі і арганізацыі фактычна знаходзіліся яшчэ на стадыі арганізацыйнага і ідэалагічнага афармлення. Вясной 1917 г. аднавіла сваю дзейнасць Беларуская Сацыялі-

стычная Грамада, аформіліся Беларуская народная партыя сацыялістаў, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларуская народная грамада, Беларускі народны саюз і шэраг іншых. Гэтыя арганізацыі толькі разгортвалі сваю дзейнасць і, безумоўна, не валодалі ні дастатковым вопытам парламенцкай працы альбо рэвалюцыйнай барацьбы, ні апаратам кадравых палітычных дзеячаў, ні фінансавымі магчымасцямі сваіх расійскіх калегаў.

З прычыны вышэйзгаданых абставінаў агульнарасійскія палітычныя партыі і арганізацыі аказвалі сур'ёзны, а па шэрагу пытанняў дамінуючы, уплыў на фарміраванне масавай свядомасці і грамадскай думкі па асноўных праблемах грамадска-палітычнага жыцця Беларусі. Стратэгічныя і тактычныя ўстаноўкі ўсіх партый у той ці іншай меры закраналі найбольш важныя і надзённыя праблемы: абвяшчэнне формаў дзяржаўнага ладу Расіі, меры па хутчэйшым заканчэнні вайны, праекты вырашэння аграрнага пытання, дзяржаўнае рэгуляванне прамысловасці, барацьба з беспрацоўем і іншыя пытанні.

У першай дэкларацыі Часовага ўрада ад 3 сакавіка 1917 г. абвяшчалася роўнасць усіх грамадзян Расійскай дзяржавы ў правах незалежна ад іх саслоўнай, рэлігійнай і нацыянальнай прыналежнасці [4, с. 419]. Адмена веравызнаўчых і нацыянальных абмежаванняў меркавала знішчыць (ліквідаваць) абмежаванні ў дачыненні правоў на жыхарства і перамяшчэнні, уласнасць, рухомую і нерухомую маёмасць, заняткі гандлем і прамысловасцю, удзел у гандлёва-прамысловых таварыствах, паступленне ў навучальныя ўстановы. Што тычыцца нацыянальных моў, то ўжыванне іх было дапушчана толькі ў справаводстве прыватных устаноў і пры выкладанні ў прыватных школах. За рускай мовай захоўваўся статус дзяржаўнай.

Аднак усталяванне палітычнай роўнасці не забяспечвала аўтаматычнай роўнасці нацый і народнасцей. Зыходзячы з палітычнай і сацыяльна-эканамічнай абстаноўкі, якая склалася ў 1917 г., дзяржаўна-прававыя акты Часовага ўрада не вырашалі нацыянальных праблем у Расіі. Больш за тое, шэраг палажэнняў дадзеных дакументаў так і засталіся на паперы [2, с. 30].

Юрыдычнае абвяшчэнне дэмакратычных свабод, з аднаго боку, і паслабленне цэнтралізаванай расійскай улады, з другога, спрыялі актывізацыі нацыянальна-палітычных рухаў на ўскраінах былой імперыі. Праграмы значнай часткі нацыянальных партый і арганізацый патрабавалі стварэння дэмакратычнай федэратыўнай Расійскай рэспублікі на аснове роўнасці ўсіх нацый і народнасцей. Канкрэтныя механізмы рэалізацыі гэтага праекта і ступень іх радыкальнасці вар'іраваліся ў залежнасці ад сацыяльнага складу арганізацый і рэгіёнаў іх узнікнення.



Вясной 1917 г. нацыянальныя партыі і арганізацыі актыўна заявілі пра сябе і ў Беларусі. Аднак варта адзначыць, што ўздым нацыянальнага руху ў Беларусі адбываўся больш павольнымі тэмпамі, чым у суседніх рэгіёнах, напрыклад, у Польшчы, Украіне, Літве, Латвіі. Дадзеная акалічнасць тлумачыцца, у першую чаргу, падзелам Беларусі ў выніку Першай сусветнай вайны на дзве часткі: заходнюю, акупаваную нямецкімі войскамі, і ўсходнюю, якая з'яўлялася прыфрантавой зонай расійскай арміі. У заходняй частцы з канца 1915 г. дзейнічаў Віленскі Беларускі Народны Камітэт, які каардынаваў працу нацыянальных, як палітычных, так і культурна-асветніцкіх арганізацый Заходняй Беларусі. Ва ўсходняй частцы Беларусі аналагічнага цэнтра не толькі не існавала, але і не магло існаваць таму, што дзейнасць у прыфрантавой зоне любых палітычных партый і арганізацый была забаронена.

Заходні фронт істотна ўплываў на развіццё палітычных і нацыянальных працэсаў у Беларусі. Па дадзеных С.С. Рудовіча, на 1 лютага 1917 г. у трох войсках Заходняга фронту налічвалася 1620,6 тыс. салдат, афіцэраў і ваенных чыноўнікаў, а таксама больш за 100 тыс. чалавек, якія праходзілі службу ў тылавых падраздзяленнях фронту [5, с. 40].

Пераважная большасць гэтых людзей былі выхадцамі з цэнтральных раёнаў Расіі, Каўказа, Сярэдняй Азіі. Акрамя таго, да пачатку 1917 г. у Беларусі асела каля 175 тыс. бежанцаў з Польшчы [1, с. 8]. Іх аб'ектыўна не цікавілі задачы і перспектывы развіцця беларускага нацыянальнага руху, а ўжо з сярэдзіны 1917 г. яны пачалі аказваць і актыўнае супрацьдзеянне працэсам нацыянальнага самавызначэння беларусаў.

Значны ўплыў у Беларусі расійскіх і польскіх палітычных сіл тлумачыцца таксама мабілізацыяй беларусаў у расійскую армію. Толькі з усходніх губерняў на франты былі адпраўлены 682,2 тыс. чалавек, што склала 12–13 % насельніцтва Беларусі [1, с. 8]. Акрамя таго, па меры набліжэння фронту велізарная колькасць людзей рушыла ў цэнтральныя часткі Расіі: у пачатку 1917 г. у розных расійскіх губернях налічвалася каля паўтара мільёнаў чалавек (1 474 444) – бежанцаў з беларускіх губерняў, што склала каля 54 % ад агульнай колькасці бежанцаў у Расіі.

Такім чынам, змена этнічнага складу насельніцтва ў Беларусі з прычыны прытоку ў Заходнія губерні вайскоўцаў з Цэнтральных і Усходніх губерняў і польскіх бежанцаў, з аднаго боку, і мабілізацыі беларусаў у войска і перасялення беларускіх бежанцаў у цэнтральную Расію, з другога боку, стала значным фактарам запаволенасці развіцця беларускага нацыянальнага руху ў параўнанні з суседзямі.

Сітуацыя складвалася такім чынам, што ў пачатку 1917 г. найбольш актыўныя цэнтры беларускага руху ўзнікалі за межамі Беларусі: у Пецяр-

бургу, Маскве, Адэсе, Арле і іншых гарадах. На новых месцах бежанцы-беларусы стваралі дабрачынныя, культурна-асветніцкія і іншыя арганізацыі, частка з якіх па меры развіцця рэвалюцыйных падзей набывала больш радыкальны характар і вылучала палітычныя патрабаванні.

Лютаўская рэвалюцыя ў Расіі актывізавала стварэнне шматлікіх партый, арганізацый і груп і на тэрыторыі Беларусі. У праграмах і стратэгічных напрамках дзейнасці кожнай з іх у той ці іншай ступені разглядалася рашэнне нацыянальнага пытання. 1917 г. – гэта перыяд кансалідацыі беларускага нацыянальнага руху. Прадстаўнікі розных сацыяльных слаёў і палітычных арганізацый імкнуліся выпрацаваць агульную платформу па пытаннях нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, асветы і культуры. Цэнтрам беларускага нацыянальнага руху стаў Мінск.

Пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі ў цэлым і ў Беларусі ў прыватнасці намецілася некалькі магчымых варыянтаў грамадска-палітычнага развіцця: парламенцкая (буржуазная) дзяржава; сацыялістычная рэспубліка; усталяванне ваеннай дыктатуры; поўная анархія, развал дзяржавы з непрадказальнымі наступствамі. Не выключалася і магчымасць вяртання да манархічнай формы кіравання. Як вядома, Лютаўская рэвалюцыя, зрынуўшы царызм, не вырашыла асноўных агульнадэмакратычных і агульнанацыянальных задач (аб міру, зямлі, барацьбе з разрухай і голадам, нацыянальнае пытанне). Гэта стала ўнутранай спружынай далейшага развіцця рэвалюцыйнага працэсу.

Стаўленне да рэвалюцыі, яе мэт і задач было неадназначным не толькі ў розных слаях насельніцтва, але і ў рамках аднаго класа. Розніца ў палітычных поглядах вызначалася гістарычнымі, геаграфічнымі, нацыянальнымі і шэрагам іншых фактараў. Сама рэвалюцыя ўяўляла сабой складанае перапляценне розных плыняў і кірункаў, класавых, агульнадэмакратычных, агульнанацыянальных тэндэнцый.

Тут і сацыялістычныя ідэалы працоўнага класа (вельмі неаднароднага па сваім складзе), і спецыфічныя патрабаванні сялянства (яшчэ больш неаднароднага, перш за ўсё па сацыяльнай стратыфікацыі), і імкненне народаў да раўнапраўя і нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння, і агульнае для большасці грамадзян, але па-рознаму ўсведамляемае жаданне дэмакратыі. Акрамя таго, неабходна адзначыць, з аднаго боку, цягу людзей да спынення вайны і ўсталявання міру, а з другога – патрыятычныя настроі, уласцівыя ўсяму народу, але асабліва моцныя ў інтэлігенцыі, афіцэрства, дробнай буржуазіі.

Аналіз расстаноўкі палітычных сіл агульнарасійскіх і нацыянальных партый восенню 1917 г. паказаў, што сацыялістычная альтэрнатыва, прапанаваная бальшавікамі, з'явілася на той момант вызначальнай тэндэнцыяй грамадска-палітычнага развіцця, а таму і рэалізавалася на практыцы ў кастрычніку 1917 г.



Супраць сацыялістычнага варыянту развіцця выступілі буйная і сярэдняя буржуазія, памешчыкі, найвышэйшае чыноўніцтва, часткі інтэлігенцыі, генералітэту і афіцэрства. У кастрычніку 1917 г. яны пацярпелі палітычнае паражэнне і ў далейшым былі пазбаўлены прывілеяў і эканамічных рычагоў, многіх падвергнулі рэпрэсіям. У той жа час рэвалюцыю падтрымала большасць рабочых і салдат, маса сялянства, асабліва пасля Дэкрэта аб зямлі, немалая частка інтэлігенцыі і многія нацыянальныя партыі і рухі. Меншавікі, эсэры, анархісты таксама выступалі ў сваіх праграмах за сацыялістычныя ідэалы. Такім чынам, большасць народа сапраўды зрабіла сацыялістычны выбар. Лідар эсэраў В. Чарноў сказаў на пасяджэнні Устаноўчага сходу, што «краіна паказала небывалае ў гісторыі жаданне сацыялізму» [3, с. 77].

Як бачым, сацыялістычныя настроі прадстаўлялі не толькі бальшавікі, усе асноўныя палітычныя партыі, акрамя кадэтаў, выступалі з сацыялістычнымі ідэямі. Аднак меншавікі і эсэры былі супраць самой пастаноўкі пытання аб пераходзе Расіі да сацыялізму менавіта ў 1917 г.

Меншавікі, спасылаючыся на непадрыхтаванасць краіны, адкладалі пераход да сацыялізму на далёкую будучыню, прапаноўвалі заняцца на дадзеным этапе буржуазна-дэмакратычным уладкаваннем грамадства. Больш за тое, яны запалохвалі масы небяспекай «скачка» да сацыялізму.

Эсэры, якія з'яўляліся носьбітамі нэанароднiцкай ідэалогіі, развівалі ідэю «асаблівага шляху» Расіі да сацыялізму праз сялянскую абшчыну і кааперацыю на аснове сацыялізацыі зямлі і ўраўняльнага землекарыстання. Але пасля лютага яны актыўна падтрымалі меншавіцкае палажэнне аб дачаснасці сацыялізму ў Расіі.

Эсэра-меншавіцкія лідары казалі пра магчымасць «трэцяга шляху», які палягаў паміж буржуазнай і бальшавіцкай дыктатурай. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі яны заявілі, што выступаюць і супраць адкрытай контррэвалюцыі, і супраць бальшавіцкай праграмы перабудовы. Аднак відавочна, што ва ўмовах класавай жорсткасці, палярызацыі рэвалюцыйных і контррэвалюцыйных сіл сама магчымасць лавіравання паміж гэтымі сіламі аказвалася нікчэмнай. Спробы рэалізаваць дадзены варыянт і ў 1917 г., і пазней, скончыліся няўдачай. Практычна «трэцяя сіла» працавала супраць Савецкай улады, на карысць контррэвалюцыі, хаця многія лідары эсэраў і меншавікоў былі шчырымі ў сваім імкненні не дапусціць яе ўсталявання.

У сувязі з гэтым асаблівую важнасць набыло пытанне пра магчымасць кааліцыі паміж бальшавікамі і іншымі сацыялістычнымі пар-

тыямі. У лістападзе 1917 г. стварэння «аднастайнага сацыялістычнага ўрада» запатрабаваў Усерасійскі выканаўчы камітэт чыгуначнага прафсаюза (Викжель). Абмеркаванне пытання аб кааліцыі прывяло да сур’ёзнага крызісу ў кіраўніцтве партыі бальшавікоў, што кажа аб надзвычайнай важнасці пытання. На пэўным этапе сур’ёзную станоўчую ролю адыграў блок бальшавікоў і левых эсэраў, у многіх раёнах існавалі аб’яднаныя бальшавіцка-меншавіцкія партыйныя арганізацыі. Але ў цэлым сацыялістычныя сілы былі занадта разнастайныя, і па цэлым шэрагу як аб’ектыўных, так і суб’ектыўных прычын, шырокая кааліцыя сацыялістычных сіл у канцы 1917 – пачатку 1918 гг. не рэалізавалася на практыцы. Спрацавалі старыя і новыя рознагалоссі, палітычны максімалізм бальшавікоў, непрыманне іх метадаў іншымі сацыялістычнымі партыямі. Меншавікі і эсэры марылі стаць «трэцяй сілай», а бальшавікі хацелі застацца адзінай сілай, якая вызначае грамадска-палітычнае развіццё краіны.

У нацыянальных рэгіёнах, у тым ліку і ў Беларусі, агульныя праблемы пагаршаліся нявырашанасцю і глыбінёй нацыянальнага пытання. Як ужо было адзначана лютаўскія падзеі ў Расіі паслужылі свайго роду каталізатарам для стварэння шматлікіх нацыянальных партый, арганізацый і груп, кожная з якіх імкнулася рэалізаваць сваю праграму і ўзначаліць нацыянальны рух. Канчатковай мэтай усякага падобнага руху з’яўляецца стварэнне незалежнай дзяржавы. У перыяд лютага – кастрычніка 1917 г. большасць беларускіх нацыянальных партый і арганізацый (Беларуская народная партыя сацыялістаў, Беларуская Сацыялістычная Грамада, Беларуская народная грамада і інш.) спалучалі ў сваіх праграмах, з аднаго боку, сацыялістычныя ідэі, а з другога – рэфармісцкія ўяўленні аб шляхах сацыялістычнай перабудовы грамадства. Яны выступілі ў падтрымку Часовага ўрада і ўзнялі патрабаванне аўтаноміі Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўна-дэмакратычнай рэспублікі.

Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Петраградзе яшчэ ў большай ступені стымулявала імкненне беларусаў да адраджэння ўласнай дзяржавы, тым больш што ў праграмных дакументах РСДРП(б) (пазней – РКП(б)) і ў першых актах Савецкай улады абвяшчалася права народаў на самавызначэнне, аж да аддзялення і стварэння незалежных дзяржаў. Аднак на практыцы Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і Заходняга фронту (Аблвыкамзах), які ажыццяўляў уладу ў Мінску ад імя бальшавікоў, выступаў супраць беларускага нацыянальнага адраджэння. У такой сітуацыі лідары нацыянальнага руху прапанавалі абвясціць Беларусь незалежнай дэмакратычнай рэспублікай з перадачай усёй улады



Краёвай Радзе. Для канчатковага вырашэння пытання пра беларускую дзяржаўнасць 15–17 снежня 1917 г. быў склікaны Усебеларускі з’езд. Сярод яго дэлегатаў выявілася некалькі альтэрнатыўных варыянтаў вырашэння дадзенай праблемы. Такое развіццё падзей супярэчыла інтарэсам бальшавіцкага кіраўніцтва Заходняй вобласці і фронту, і таму з’езд быў разагнаны.

Далейшыя падзеі (наступ нямецкіх войскаў на Беларусь, падпісанне сепаратнага мірнага дагавора паміж Савецкай Расіяй і Германіяй, абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі) прывялі да расколу ў беларускім нацыянальным руху, што, у сваю чаргу, негатыўна адбілася на яго далейшым лёсе. З прычыны знешніх і ўнутраных фактараў у Расіі і Беларусі ў 1917–1918 гг. з усіх магчымых альтэрнатыў грамадска-палітычнага развіцця рэалізаваўся сацыялістычны варыянт, прапанаваны бальшавікамі. Гэта ў сваю чаргу паўплывала на рашэнне праблемы нацыянальнай дзяржаўнасці і самавызначэння Беларусі ў яе савецкім варыянце.

***Спіс выкарыстаных крыніц***


1. Кобрын, М.У. Беларускі нацыянальны рух: 1917–1920 / М.У. Кобрын. – Мінск : Беларус. выд. т-ва «Хата», 2004. – 95 с.
2. Макарова, Т.П. Из истории национально-освободительного движения в России в 1917 г. : Восточные районы / Т.П. Макарова. – М. : Наука, 1979. – 224 с.
3. Октябрь 1917: величайшее событие века или социальная катастрофа? / под ред. П.В. Волобуева. – М. : Политиздат, 1991. – 240 с.
4. Революционное движение в России после свержения самодержавия: документы и материалы / под ред. Л.С. Гапоненко. – М. : Акад. наук СССР, 1957. – 857 с.
5. Рудовіч, С. Час выбару: праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе / С. Рудовіч. – Мінск : Тэхналогія, 2001. – 201 с.


УДК 94(82)(=161.3)

***С.В. Шабельцев***

## ТРАНСФОРМАЦИЯ ЭТНОНИМА «БЕЛОРУСЫ» В ЭМИГРАНТСКОЙ СРЕДЕ В АРГЕНТИНЕ ПОСЛЕ ОКТЯБРЬСКОЙ РЕВОЛЮЦИИ 1917 г.

Октябрьская революция 1917 г. коренным образом изменила общественно-политический строй на просторах бывшей Российской империи. Одним из важных новшеств стала национальная политика коммунистической партии, провозгласившей равенство всех народов и